**Праект.** Баль «Бібліятэчнае лета» ўпершыню пройдзе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі заўтра. Танцавальныя калектывы з розных гарадоў нашай краіны збяруцца разам, каб прадставіць маштабную танцавальную праграму. На шматлікіх майстар-класах зацікаўленыя госці змогуць засвоіць розныя элементы танца, абяцаюць арганізатары. Бібліятэчныя залы будуць адчынены для ўсіх жадаючых. Напрыклад, у зале беларускай літаратуры прадставяць майстэрню рэстаўратара, у зале дакументаў па мастацтве правядуць экскурсію па выстаўцы, прысвечанай Эдгару Дэга, а ў галерэі «Лабірынт» будзе працаваць музычна-літаратурная гасцёўня: прагучаць вершы у суправаджэнні раяля.